Шкоднае зелле

Аўтар: Анна Віткоўская
28.02.2014 00:00

Юля і Аня разам са сваёю матуляй займаліся ў агародзе праполкай. Праца ішла хутка і весела, дзяўчынкі паспешна рвалі зелле, якое расло сярод гародніны, і не заўважалі, як пралятаў час, таму што ўважліва слухалі цікавыя гісторыі, якія расказвала мама. А яна расказвала дачушкам пра тое, як раней жылі людзі ў вёсках, кім была прабабуля дзяўчынак, які смачны хлеб яна пякла ў печы... Перад тым, як скончыць працу, малодшая дзяўчынка акінула поглядам праполатае месца, і ёй стала шкада той травы, якая раней красавалася сярод град, усыпаючы ўвесь агарод разнастайнымі дробнымі кветачкамі.

– Матуля, – сказала Аня, – я больш не буду палоць гэтую градку. Мне сумна глядзець цяпер на наш агародзік: тут так прыгожа каласіўся пырай, цвіў малачай і канюшына, а пасля нашай праполкі пуста стала, толькі дзе-нідзе парасткі агуркоў. Няма чым мне палюбавацца!

Маці пагадзілася і ўшанавала жаданне сваёй маленькай дачушкі, таму палова агурочнай градкі засталася непраполатай. † Тыдні праз два на рынку пачалі з'яўляцца першыя агуркі, памідоры ды іншая гародніна. Маленькая Аня больш за ўсіх стамілася чаканнем, калі ж з'явіцца магчымасць сарваць свежанькі агурочак ці вырваць сакавітую моркву. Якое ж было яе здзіўленне, калі на непраполатай градцы яна не знайшла нічога, акрамя адцвілага зелля! З сумным выглядам яна вярнулася да матулі.

– Мамачка, – сказала яна са слязамі на вачах, – ты ведаеш, што я перш цешылася, гледзячы на градку, якую ты дазволіла не палоць, а зараз на ёй няма нічога, акрамя засохлага зелля, а на той частцы, якую мы прапалолі разам з табой і Юляй, ужо з'явіліся маленькія агурочкі. Матуля з пяшчотай паглядзела на сваю маленькую дачушку і, суцяшаючы яе, сказала:

– Дарагая мая Анечка, памятай, што агарод падобны на нашу душу. Як і ў агародзе, у нашай душы ёсць шмат добрага, але ёсць і дрэннае. Добрыя расліны ў агародзе падобныя на добрыя жаданні ў нашай душы, а зелле – гэта нашы грахі і дрэнныя жаданні. Часам нам здаецца, што гэтыя "кветачкі" не могуць перашкодзіць гародніне на градцы, але насамрэч гэта не так. Як табе сумна было глядзець на вычышчаны агарод, таму што ён зрабіўся пустым, так сумна і цяжка чалавеку пакінуць свае дрэнныя звычкі, без іх жыццё здаецца яму нецікавым. Ён не пакідае іх, не імкнецца вынішчыць. І што ж? Яны прыводзяць яго на край згубы. Усё добрае ў ім памірае, ён перастае любіць Бога, блізкіх, бацькоў. Грэх знішчае нашу душу, пазбаўляе нас жыцця. Калі чалавек памірае, ён становіцца перад Богам, і аказваецца, што няма ў чалавека нічога, ніякіх добрых учынкаў. А грахі, як табе цяпер гэтае зелле, не здаюцца яму прыемнымі. На жаль, пасля таго, як чалавек памірае, ён ужо нічога не можа змяніць. Таму ў Евангеллі сказана: "Ужо

сякера прыкладзена да карэння дрэў. Таму кожнае дрэва, якое не дае добрага плоду, будзе ссечана і кінута ў агонь” (Мц 3, 10). Не забывай пра гэта, дарагая мая! Дрэва, якое не прыносіць пладоў – гэта тое самае, што і зелле. Яно азначае чалавека, які не робіць добрых спраў, чалавека, адданага загане. Пазбягай граху – гэтага шкоднага зелля, якое так часта заглушае ў людзях добрае.